МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
11 кастрычніка 2017 г. №38 (422)



стар. 2

Актыўны рух... без аўтамабіля



стар. 3

Дарогі аддалі спецыялістам



стар. 8

Прыгожа, чыста і без паху

ТЭМА ТЫДНЯ

# НА ХВАЛІ АПТЫМІЗАЦЫІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ПРАЙШЛО чатыры гады пасля апошняй хвалі аптымізацыі сельсаветаў цэнтральнага рэгіёна. Мінская вобласць стала першапраходцам у гэтай справе. Ці апраўдала ўзбуйненне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак пярвічнага ўзроўню чаканні ўладаў і жыхароў, высвятляла «Мясцовае самакіраванне».**

стар. 4

СЕСІЯ

# ПАСАДЗІ СВАЁ ДРЭВА

## Сесія Баранавіцкага раённага Савета дэпутатаў разгледзела пытанні патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання школьнікаў і навучэнцаў

**Такія праблемы, згадзіцеся, не часта выносяцца на разгляд дэпутатаў мясцовых Саветаў. Дэпутаты ўсё больш аналізуюць добраўпарадкаванне, жыллёва-камунальную гаспадарку, навядзенне парадку на зямлі. Усё пералічанае ажыццяўляецца для паляпшэння якасці і ўзроўню жыцця кожнага грамадзяніна. Той жа парадак на зямлі мае на ўвазе цэлы комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні прыстойнага стану зямлі, прыроднай разнастайнасці, рэк і азёр — для таго, каб парадак і пакаленню, якое падрастае. А яно, гэтае пакаленне, павінна разумець і цаніць спадчыну бацькоў, ведаць гісторыю і сённяшні дзень сваёй краіны. На гэта і накіравана выхаваўчая работа.**

ДЭПУТАТ Ірына БАСАН, намеснік дырэктара Карчоўскай сярэдняй школы, расказала пра краязнаўчую работу, якая шмат гадоў праводзіцца ў навучальнай установе. Настаўнік гісторыі Віктар Мініч вядзе адпаведны гурток. Паколькі школа і навакольныя вёскі размешчаны па суседстве з малой радзімай Адама Міцкевіча, пошукі вядуцца ў гэтым кірунку. Аднойчы школа нават атрымала дазвол ад абласной улады на правядзенне міні-раскопак у Туганавіцкім парку. Парк, што авеяны легендамі пра сустрэчы вялікага паэта з каханай, хавае ў сабе шмат таямніц. Таму дзеці пад кіраўніцтвам свайго педагога з вялікім задавальненнем правялі раскопкі на адведзенай тэрыторыі. Знайшлі тады прадметы побыту, фрагменты посуду, манеты. Акрамя гэтага, «акунуліся» ў рамантызм таго часу, адчулі сябе юнымі археолагамі і, несумненна, папоўнілі сваю капілку ведаў.

Усе знойдзеныя ў парку трафеі належным чынам афармілі і ўладкавалі ў музейны куток. Потым вывучалі знакаміты камень філарэтаў. Ён знаходзіцца недалёка ад вёскі Карчова. Ля яго, паводле падання, сустракаліся члены студэнцкай падпольнай патрыятычнай арганізацыі — Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ігнат Дамейка і іншыя. Вядома, настаўніку даводзіцца на згаданую тэму праводзіць невялікія лекцыі. Але побач з гістарычным валуном яны ўспрымаюцца і засвойваюцца лепш, чым у класе. Дзеці такім чынам як бы «дакранаюцца» да духоўнай спадчыны свайго краю, спасцігаюць гісторыю краіны праз канкрэтныя эпізоды мінулага малой радзімы.

ВЯЛІКАЯ даследчая работа праводзіцца таксама ў Жамчужненскай сярэдняй школе, дзе і праходзіла пленарнае пасяджэнне сесіі. Вучні настаўніцы Ірыны ДУБЕЙКІ, аўтара кніг па гісторыі Баранавіцкага раёна, не раз атрымлівалі адзнаку на рэспубліканскім узроўні за даследчыя работы. Школа нярэдка станавілася пераможцам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў па рэалізацыі розных праектаў. Напрыклад, такіх як праект шостага школьнага дня «Захаваць жыццё на сяле».

стар. 3